23 сентября, четверг 1999 г.
N38 (83)
Приложение - программа ТВ
Цена - 25000 руб.

Биржа информации

США обеспокоены

Пресс-секретарь посольства США в Минске Диана Мокси заявила, что правительство Соединенных Штатов очень обеспокоено исчезновением одного из лидеров белорусской оппозиции Виктора Гончара. По словам Д.Мокси, США призвали белорусские власти сделать все возможное, чтобы найти Гончара и обеспечить его безопасность. Правительство США "очень сильно" поддерживает идею переговоров между белорусскими властями и оппозицией под эгидой ОБСЕ, но, в то же время, с пониманием относится к позиции Верховного Совета, который отмечает, что плодотворный диалог с властями невозможен без эффективного расследования случаев исчезновения людей, сказала пресс-секретарь.

Позняк пишет



Представители Министерства юстиции Беларуси обратились к исполняющему обязанности председателя Белорусского народного фронта Левону Борщевскому за справкой о том, кто является руководителем организации в Беларуси. Это вызвано тем, что министерство получило письмо от председателя БНФ Зенона Позняка, который находится в эмиграции в Варшаве, с информацией о том, что должность руководителя БНФ в Беларуси перешла от Л.Борщевского к заместителю председателя БНФ Юрасю Беленькому.

Как известно, 11 сентября сойм БНФ принял резолюцию о том, что распоряжения Позняка об отстранении Левона Борщевского от должности исполняющего обязанности председателя БНФ и о назначении на 26 сентября отдельного съезда партии БНФ "противоречат уставу партии" и не имеют юридической силы. Однако часть членов сойма, присутствовавших на заседании, в том числе и Беленький, отказались регистрироваться и заявили, что сойм не правомочен принимать решения из-за отсутствия кворума.

По мнению Борщевского, попытки поставить под сомнение решения сойма -- это "игры людей, которые хорошо знают, что нарушают устав". По его словам, сегодня делаются попытки фальсифицировать документы предстоящего 26 сентября "собрания" членов партии БНФ, дополнив список делегатов.

Алексей ЗНАТКЕВИЧ

Знікаюць людзі

ЗА ГАНЧАРОМ - ЛУКАШЭНКА?

- Як распачаць перагаворы з уладамі, калі рэпрэсіі сярод апазіцыі надалей узмацняюцца? - пытаюцца дэпутаты ВС 13-га склікання. У мінулы чацвер знік выконваючы абавязкі старшыні ВС Віктар Ганчар, у нядзелю перарвалі працу сесіі ВС.

Захоўваючы поўную кансперацыю, дэпутаты сабраліся на плошчы Незалежнасці ў цэнтры Мінска. Адтуль аўтобус прывёз іх у кінатэатр "Перамога". На гэтым аднак сімволіка назваў не скончылася. У кінатэатры ў той час дэманстраваліся фільмы "Вораг дзяржавы" і "Татальная слежка". Загалоўкі фільмаў аказаліся самым натуральным прароцтвам. Галоўным пунктам паседжання ВС павінен быў стаць даклад у якім падсумоўваліся пяць гадоў кіравання А. Лукашэнкі Беларуссю. Паседжанне аднак трывала толькі паўгадзіны. Адміністрацыя кінатэатра запатрабавала, каб дэпутаты пакінулі залу, паколькі ў іх адсутнічалі арыгіналы дакументаў на права арэнды памяшкання. Дэпутаты пагадзіліся, што, дарэчы, выклікала здзіўленне і расчараванне прысутнічаючых у зале 200 прадстаўнікоў незалежных прафсаюзаў, якіх на паседжанне прывёў іх лідэр - Сяргей Антончык. - Як нам вас паважаць? Колькі яшчэ можна баяцца? - крычалі прадстаўнікі незалежных прафсаюзаў.

Такім чынам на стале, дзе засядаў прэзідыўм, засталася толькі картачка з надпісам "В.а. старшыні ВС - Віктар Ганчар". Дарэчы, ад самага пачатку побач з ёй пуставала месца. - В.Ганчар у мінулы чацвер знік пры таямнічых абставінах.

(Працяг на ст. 2)

Візіты

З ЯМАЛА Ў ЕЎРОПУ ПРАЗ СЛОНІМ

У аўторак, 21 верасня, Слонімшчыну наведаў Аляксандр Лукашэнка. На гэты раз нагодай для візіту сталі ўрачыстасці, прысвечаныя пуску першай чаргі беларускага ўчастка газаправода "Ямал - Еўропа".

Прыкладна, у 13.30 у раёне вёскі Парэчча Слонімскага раёна прызямліўся верталёт А.Лукашэнкі. А ў той час на пляцоўцы ўжо знаходзіліся тры верталёты, і ў адным з іх прыляцеў старшыня праўлення "Газпрама" Рэм Вяхіраў. Менавіта яму ў гэты дзень Лукашэнка ва ўрачыстай абстаноўцы прышпіліў на грудзі адну з найвялікшых узнагарод краіны - ордэн "Знак Пашаны", які ў той дзень зіхацеў на пінжаку Вяхірава. За што ж так высока быў адзначаны расійскі бізнесмен? Напэўна за тое, што, шмат у чым, менавіта ад яго залежаць пастаўкі прыроднага газу ў нашу краіну з Расіі. А па стану на 1 верасня гэтага года, па інфармацыі Інтэрфакса, Беларусь мела запазычанасць перад "Газпрамам" 270, 4 млн. даляраў ЗША. Таксама гэтае інфармагенства адзначала, што пытанне запазычанасці па плацяжах было адной з тэм перамоваў Лукашэнкі і Вяхірава на Слонімшчыне. Хаця Аляксандр Рыгоравіч падчас размовы з народам упэўнена заявіў, што Беларусь нічога не павінна Расіі за газ. А ў 2000 годзе, калі на поўную магутнасць запрацуе новая газавая ветка па нашай тэрыторыі, то беларускі бок спадзяецца 50 % кошту "блакітнага паліва" аплочваць шляхам узаемаразлікаў за транзітныя паслугі, а астатнія 50 % - за кошт росту плацежаздольнасці беларускіх спажыўцоў.

Магчыма, з улікам гэтага ўлады надалі столькі ўвагі сібірска-еўрапейскай газавай трубе. Пасля выступу Лукашэнкі і іншых афіцыйных асобаў, засаўку ў газавай трубе асвяціў праваслаўны святар. Пасля гэтага 10 лепшых рабочых па эстафеце перадалі паходню, ад полымя якой быў запалены сімвалічны агонь.

(Працяг на ст. 2)



21 сентября. Рынок "Южный" в Гродно. Встреча власти с предпринимателями

РЫНОК "ЮЖНЫЙ": МЫ - ВЫСТОЯЛИ!

До сих пор не удается расхлебать кашу, круто заваренную Александром Лукашенко, питающим особые симпатии к предпринимателям вещевых рынков. А те, в свою очередь, на "царский гнев и царскую любовь" отвечают взаимностью - взяли да забастовали.

На вещевом рынке "Южный" г.Гродно волна протеста поднялась столь высоко, что она докатилась и до столицы. Местные лидеры берут на себя смелость сочинять проекты высочайших декретов. А это уже потрясение основ! Но если не пойдешь на уступки, то крепко возмутятся остальные коммерсанты, и тогда акция протеста приобретет угрожающие масштабы и непременно окрасится в политические цвета. Этого столица боится, как черт ладана. Тем более сегодня, когда политикой государства мало кто очарован: на пустой желудок славить власть все меньше дураков. Отсюда и поиск компромисса, и посылка в Гродно столичных комиссаров, и активизация региональных властей.

На днях этому вопросу было посвящено совещание в облисполкоме. Появился и проект документа, которым предусматриваются некоторые уступки предпринимателям. А 21 сентября власти высадили представительный десант на рынке "Южный", его возглавил зам. председателя облисполкома Михаил Беляев. Это был продолжительный - более двух часов - диалог с предпринимателями, крупно - десятками лиц - представленными на этом совещании под открытым небом. И поскольку коммерсанты недовольны сложившейся практикой сертификации и гигиенической регистрации, перед ними выступили руководитель Центра стандартизации и метрологии Владимир Шиш и главный санитарный врач области Виктор Пышный. Участвовали в разговоре с предпринимателями начальник инспекции Налогового комитета по г.Гродно Петр Володько, председатель территориального комитета по предпринимательству и инвестициям Михаил Логвин, начальник управления Министерства предпринимательства и инвестиций Сергей Гараев и др. Была на совещании и зам. мэра г.Гродно Валентина Лавцель.

Микрофон предлагался и предпринимателям, заявившим о готовности выступить или задать вопрос. И в этом смысле разговор был вполне демократичным. Чувствовалось стремление чиновников снять напряжение в среде предпринимателей и побудить их к скорейшему выходу на работу. А Сергей Гараев высказал "большое пожелание": начать работу рынка через три дня. Это вызвало большой ропот среди коммерсантов. Чувствовалось, что они недовольны половинчатостью предложенных мер. И они явно сомневались, что декрет президента будет откорректирован в их пользу. И когда был вынесен на голосование вопрос о прекращении забастовки в предложенные сроки, лишь считанные руки поднялись вверх. Похоже, что рефреном доминирующих настроений предпринимателей были не раз произнесенные слова: "Перестаньте нас душить!" Они сами предлагают резко повысить ставку фиксированного налога, о чем говорил, в частности, и признанный де-факто лидер гродненских предпринимателей, член республиканского совета Свободного профсоюза белорусского Валерий Левоневский. Их угнетает абсурдность требований со стороны государства, а также некорректные действия налоговых инспекторов, милиции и т.д. И, конечно же, им пришлись по душе заявления, что предпринимателям впредь не нужны документы, подтверждающие происхождение их валюты, что сокращается перечень товаров, подлежащих сертификации, что имущество коммерсантов не подлежит конфискации...

- Мы выстояли, - сказал в порядке обобщения импровизированного диалога начальства и предпринимателей Валерий Левоневский. - Это хорошо, что власть заявила о гарантиях. И ей надо дать шанс... Я буду инициировать вопрос о выходе на работу с 1-го октября...

Показательна и "ударная" фраза и.о. председателя профсоюза предпринимателей вещевого рынка "Южный" Александра Васильева. Она была адресована тем предпринимателям, которые склонны выйти на работу как можно скорее. Суть сказанного им в следующем: вы можете приступать к работе, это ваше право, но есть еще и решение профсоюза провести 28 сентября собрание, где и будет принято окончательное решение...

Вадим ЖУРАВЛЕВ

З Н І К А Ю Ц Ь Л Ю Д З І

ЗА ГАНЧАРОМ - ЛУКАШЭНКА?

(Заканчэнне. Пачатак на ст. 1)

Улады сцвярджаюць, што яго знікненне было падрыхтавана самім Ганчаром і расцэньваюць гэта як правакацыю накіраваную на тое, каб прыцягнуць увагу да сваёй асобы. Так прызнамсі лічыць намеснік старшыні Адміністрацыі прэзідэнта І.Пашкевіч. - Шукайце іх лепш у сябе - звярнуўся непасрэдна да заходніх дыпламатаў сам Аляксанд Рыгоравіч падчас святкавання 60-годдзя далучэння Заходняй Беларусі да БССР. Гэтым самым намякнуўшы, што і Ганчар, і генерал Ю.Захаранка, які пры падобных акалічнасцях знік напачатку мая, хаваюцца за мяжой. - Беларусы гасцінны народ, але мы ніколі не дазволім сваім гасцям паводзіць сябе ў нас як гаспадарам - дадаў А.Лукашэнка. Магчыма яго знервавала рэакцыя дыпламатаў нанонт знікнення В.Ганчара. - Гэтым занепакоены ўвесь свет - заявіў у пятніцу пасол ЗША ў Мінску Даніэл Спекхарт, які ў той жа дзень павінен быў сустрэцца з Віктарам Іосіфавічам. Аднак замест гэтага яму давялося тэлефанаваць да міністра Замежных спраў Беларусі і прасіць, каб той растлумачыў яму сітуацыю. Тое ж зрабілі амбасады Германіі і Францыі, ды місія АБСЕ, якая, дарэчы, асабліва занепакоена тым фактам, што В.Ганчар знік якраз тады калі і апазіцыя, і афіцыйныя ўлады заяўляюць аб гатоўнасці да перагаворнага працэсу.

Тым часам ВС, які лічыць сябе адзіным легітымным органам заканадаўчай улады, паставіў умовы, што пачне перагаворы толькі пасля таго як з'явіцца вынікі ад пошукаў зніклых апазіцыянераў. На адбыўшымся ўсё ж паседжанні ВС, якое правілі ў памяшканні АГП 39 дэпутатаў, было аднагалосна вырашана, што пакуль улады не дакажуць, што яны сапраўды заняліся пошукамі згінуўшых людзей, ніякіх перагавораў не адбудзецца. У панядзелак 11 дэпутатаў ВС побач з будынкам адміністрацыі Лукашэнкі правілі нелегальную дэманстрацыю пад лозунгам "За Ганчаром - Лукашэнка!". Яны перадалі петыцыю дзяжурнаму міліцыянеру ў якой звярнуліся з патрабаваннем неадкладных пошукаў апазіцыянераў. Аднак яны былі ацэплены міліцыяй і людзьмі са службы аховы прэзідэнта ў цывільным. Праўда, ніхто з дэманстрантаў не забралі і яны накіраваліся ў пракуратуру, каб і тут перадаць свае патрабаванні. - Дакумент прынялі, але ніхто з чыноўнікаў не захацеў з намі размаўляць, спасылаючыся на тое, што няма часу - сказаў лідэр ПКБ, С.Калякін, які разам са старшынёй АГП, С.Багданкевічам, спрабаваў патлумачыць сваю пазіцыю ў пракуратуры.

Такім чынам атмасфера перад перагаворамі паміж уладай і апазіцыяй пагоршылася. Прычынай таму - прадчуванне новых рэпрэсій. Падчас нарады з кіраўнікамі сілавых структур А.Лукашэнка запатрабаваў "у сувязі з неабходнасцю выкліканай тэрактамі ў суседняй Расіі захаваць парадак у дзяржаве" шляхам забароны апазіцыйных дэманстрацый, акцыяў пратэсту прафсаюзаў на прадпрыемствах і публікацыяў у СМІ матэрыялаў, "якія маглі б дэстабілізаваць сітуацыю". І рэакцыі доўга чакаць не давялося. Па загаду Лукашэнкі старшыня Савета бяспекі падаў у суд на газету "Навіны", якая пацікавілася станам яго маёмасці. В.Шэйман патрабуе 15 мільярдаў рублёў. - Давядзецца зноў адкрываць новую газету - гаворыць галоўны рэдактар і выдавец "Навінаў" - Павал Жук. Дарэчы, ён ужо мае ў гэтым вопыт - "Навіны" з'явіліся пасля таго як гаспадарчы суд закрыў газету "Свабода".

Аб ліквідацыі газеты "Імя" заявіў ўжо яе выдавец П.Марцаў. Прычыны падобныя - пастаянны палітычны і фінансавы прэсінг з боку уладаў. Пацярпела таксама "Народная воля" - "Белсаюздрук" адмовіўся прадаваць яе ў кіёсках пасля таго як у газеце быў апублікаваны матэрыял у якім узгадвалася аб тым як 10 гадоў таму ва Усходняй Еўропе развaліўся таталітарызм, і зараз на старым кантыненце існуюць толькі два аўтарытарных рэжымы - у Белградзе і ў Мінску.

Усё гэта адбылося напрыканцы мінулага тыдня якраз на фоне паляпшэння кансультацый паміж уладамі і апазіцыяй на тэму магчымасці доступу апазіцыі да дзяржаўных СМІ.

Андрэй МЯТЛІЦКІ



Депутаты требуют найти Гончара

Созданная по решению президиума Верховного Совета (ВС) Беларуси 13-го созыва депутатская комиссия по расследованию обстоятельств исчезновения первого заместителя председателя ВС Виктора Гончара намерена всячески противодействовать торможению следственных действий со стороны властных структур. Как заявил корреспонденту БелаПАН пресс-секретарь комиссии Валерий Щукин, в торможении нельзя обвинить непосредственно милицию, которая "вынуждена действовать по указке сверху". "Правоохранительные органы с видимым нежеланием взялись расследовать обстоятельства исчезновения Гончара и находившегося с ним Анатолия Красовского. В понедельник, 20 сентября, с помощью проведенной депутатами акции по передаче петиции в администрацию Лукашенко и Прокуратуру мы заставили власти возбудить уголовное дело. Однако затем вновь появились признаки торможения: по телевидению было объявлено, что нет необходимости распространять среди сотрудников правоохранительных органов фотографию Гончара в связи с известностью его фигуры. Конечно, о политической активности Гончара знают очень многие граждане, в том числе и сотрудники милиции, но это отнюдь не означает, что в такой же степени его знают в лицо", -- отметил В.Щукин и подчеркнул: "Как только процесс расследования начинает затухать, мы немедленно поднимаем шум". 17 сентября от имени комиссии В.Щукин передал в Министерство внутренних дел письмо на имя министра Ю.Сивакова с предложением оказывать взаимное содействие при расследовании обстоятельств исчезновения В.Гончара. По признанию В.Щукина, исчезновение первого вице-спикера стало нокдауном для белорусской оппозиции в целом и Верховного Совета в частности. "Верховный Совет обезглавлен: Гончар исчез, Шарецкий, уехав в Литву, фактически стал символом, как Позняк -- для БНФ. Исполняющему обязанности председателя Верховного Совета Геннадию Терене необходимо время, чтобы освоиться, восстановить потерянные связи", -- сказал В.Щукин.

БелаПАН

Г Р О Д Н А

Оштрафован председатель кооператива

Возбуждение дела по инициативе Хозяйственного суда Гродненской области - явление не столь частое, но вполне правомерное. То же можно сказать о действиях судьи Сергея Кулаковского, который установил, что РСУ арендного производственного объединения "Гродноoблтранс", оказав строительные услуги ЖСК №125, не получило полного расчета со стороны заказчика. Задолженность в размере 467,5 миллиона рублей не погашалась кооперативом с июля 1998 года. А между тем строительство 89-квартирного дома по ул. Дзержинского г.Гродно было завершено еще осенью 1997 года.

Последствия инфляции, пеня за просрочку платежа, судебные издержки легли в итоге на плечи ответчика, который по решению Хозяйственного суда обязан перечислить в пользу АПО "Гродноoблтранс" 1,6 миллиарда рублей. Исполнение данного решение затянулось по вине председателя ЖСК Леонида Угляницы. На р/с жилищного кооператива денег не оказалось, поэтому взыскание было обращено на имущество должника. Председатель ЖСК был обязан предоставить необходимые в данном случае документы. Однако в положенные сроки это не было сделано. И тогда Хозяйственный суд рассмотрел вопрос о привлечении к ответственности председателя ЖСК.

Суть вынесенного постановления: наложить штраф в размере 20 миллионов рублей. Таким образом Леонид Угляница обязан пополнить местный бюджет из содержимого собственного кошелька. Должны быть удовлетворены и имущественные интересы АПО "Гродноoблтранс" за счет средств задолжавших членов ЖСК. Одновременно судьей С. Кулаковским поставлен вопрос перед органами милиции и прокуратуры о возбуждении уголовного дела в отношении председателя кооператива Л. Угляницы за срыв возмещения убытков кредитору и за неисполнение решения Хозяйственного суда. Есть о чем задуматься и другим председателям жилищных кооперативов-должников...

В. АЙДАРОВ

"Тутэйшыя" без білетаў

У мінулую нядзелю Гродзенскі тэатр лялек адкрыў свой 19-ты сезон спектаклем "Тутэйшыя". Гэтую п'есу Янкі Купалы першы раз паставілі тут у 1991 годзе. З таго часу яна зрабілася візітнай карткай тэатру. "Гэта самая лепшая беларуская п'еса", - падкрэсліў перад пачаткам спектакля галоўны рэжысёр тэатру М.Андрэеў. Купала напісаў яе ў 1924 годзе, але і дагэтуль, як не дзіўна, яна застаецца цалкам актуальнай.

Ужо ў 12 гадзін на тэатральных дзвярах вісела цыдулка: "На 19.00 усе білеты прададзеныя". Аказваецца, дырэктар тэатру вялікую частку білетаў размеркаваў мясцоваму начальству, але з іх ніхто не прыйшоў. Атрымалася, што ў тэатры шмат вольных месцаў, а білетаў ужо няма. За 10 хвілін да пачатку спектакля ў касе пачалі прадаваць размеркаваныя білеты. Стварыўся штучны ажыятаж.

Дарэчы, на спектаклі прысутнічалі 28 студэнтаў з Гданьска, якія закупілі білеты гуртам. Яны сказалі, што зразумелі сэнс п'есы толькі часткова. Некаторыя з іх вучацца на рускай філалогіі, ну а беларускай мовай ніхто, напэўна, добра не валодае.

Увогуле, людзей было вельмі шмат. Праходзячы каля нейкай даволі сталай пары, я пачула, як жанчына запыталася ў свайго сябра: "Ты хоть по-белорусски что-нибудь понимаешь?"

Пасля спектакля прайшла творчая вечарына. Юры Гумянюк чытаў вершы, а Віктар Шалкевіч праспяваў некалькі песняў на польскай мове.

Т.БАЗЫЛЕВІЧ

Контакт с гарвардскими политологами

На днях г.Гродно посетила группа ученых, политологов Гарвардского университета (США) - д-р Джеймс Клем. Маргарита Мерседес Бальмаседа и др.

Американские интеллектуалы побывали в общественном объединении "Ратуша". Здесь и состоялся заинтересованный диалог с членом президиума Верховного Совета 13-го созыва Семеном Домашем, председателем объединения "Ратуша" Александром Милинкевичем, председателем Товарищества белорусской высшей школы профессором Алесем Островским, представителем молодежного объединения "Рада-23" Виталем Никоновичем. Гарвардских ученых интересовала общественно-политическая ситуация в Беларуси и регионе, жизнь партий, общественных движений и организаций, проблемы, связанные с созданием гражданского общества, построением демократического правового государства в нашей стране.

Примечательно, что среди американских гостей была Элизабет Тарлоу, родовые корни которой связаны с Гродненщиной. Ее прадед Иосиф Тарловский в 1890 году эмигрировал в США. После этого он лишь однажды - в 1908 году - приезжал в Принеманский край. И тут же Иосиф увлек за океан и своего брата. После посещения Гродно у г-жи Тарлоу окрепло желание побольше узнать о своей родословной и жизни ее предков в Беларуси.

В. СУЗДАЛЬСКИЙ

В І З І Т Ы

З ЯМАЛА Ў ЕЎРОПУ ПРАЗ СЛОНІМ



А. Лукашэнка і Р. Вяхіраў на ўрачыстасці, прысвечанай пуску першай чаргі беларускага ўчастка газапровода "Ямал - Еўропа"

(Заканчэнне. Пачатак на ст. 1)

Потым усе ўдзельнікі ўрачыстасці накіраваліся да сталоў, якія былі накрытыя ў вялізных вайсковых палатках. Па словах запрошаных, там было шмат гарэлкі з этыкеткай "Ямал-Заходняя Еўропа" мінскага разліву, а вось закускі бракавала.

Дарэчы, у гэты дзень добра пашанцавала і жыхарам вёсак Парэчча і Васілевічы. Кааператары літаральна завалілі паліцы сялянскіх крамаў таннымі прадуктамі. Людзі нарэшце атрымалі магчымасць купіць цукар, каўбасы і іншых прадуктаў, якія ў апошні час сталі дэфіцытам. У адны рукі давалі і па дзве бутэлькі віна па цане 156 тысяч рублёў за пляшку. Аднак, набіўшы торбы прадуктамі, людзі не здолелі трапіць да месца, дзе праходзіла ўрачыстасць. Усе шляхі перакрылі ахоўнікі Аляксандра Лукашэнкі і міліцыя. У масоўцы ў асноўным удзельнічалі афіцыйныя асобы, а таксама журналісты. Хаця мясцовыя жыхары даволі старанна рыхтаваліся да прыезду кіраўніка дзяржавы. Напрыклад, у панядзелак вучні старэйшых класаў Парэчскай школы, замест заняткаў цэлы дзень збіралі смецце, трэслі з дрэў жоўтае лісце, фарбавалі на могілках плот. А механізатары калгаса "Перамога" пад пільным наглядам старшыні гаспадаркі прыводзілі палеткі ў належны выгляд. Але ўсе тыя прыгажосці Аляксандр Рыгоравіч так і не пабачыў. Паабедаўшы ў палатцы разам з Вяхіравым, ён першым паляцеў да Мінску.

ГС

У "Мішуткаў" хутка юбілей

Хутка дзіцячы ўзорны ансамбль са Смаргоні "Мішуткі" адзначыць свой 20-гадовы юбілей. За гэты час юныя артысты пабывалі не толькі ва ўсіх куточках Беларусі, але і ў шмат якіх гарадах Расіі, Польшчы, Літвы, удзельнічалі ў шматлікіх конкурсах і фестывалях. Не падлічыць і колькасці ўзнагародаў і прызоў, якія заслужыў дзіцячы ансамбль, якім увесь час кіруе Таццяна Грубчэнкова. І нядаўна з Салігорска юныя смаргонскія артысты прывезлі прыз сімпатый гледачоў "Надзея", які яны атрымалі на рэспубліканскім фестывалі народнай творчасці "Залатыя ключы".

П.МАКЛЮК

Погоня за варварами

Браконьеры ловят рыбу, а их отлавливают работники Гродненской областной инспекции Комитета рыбоохраны. И только за 8 месяцев т.г. они задержали 937 нарушителей правил рыболовства. При этом сумма штрафов составила 1,3 миллиарда рублей. Плюс 130 миллионов рублей за причиненный браконьерами ущерб природным ресурсам. Запрещенными орудиями лова запятнали себя 899 человек.

Электрические установки - наиболее варварский прием добычи "ухи". За отчетный период их изъято 17 штук. Так, на р. Котре задержаны В. Мединцев и В. Токть. Размер наказания - 21 миллион рублей. На той же речке попались Н. Гринкевич и В. Черновский. Мера возмездия - 10,2 миллиона рублей. А вот на Немане незаконным способом промышляли А. Ёда, В. Сидорович, И. Метлюк. Здесь штрафные санкции превысили 13,5 миллиона рублей.

Названные примеры - не самые свежие. В пору сказать, что последние недели рыбоохраны отмечены хроническим голодом на горючее. А пешим ходом за браконьерами не слишком угонишься.

В.АНДРЕЕВ

Новогрудский семинар

"Развитие предпринимательства в Новогрудском районе" - тема областного семинара, недавно состоявшемся в древней столице ВКЛ. В Новогрудок съехались председатели гор- и райисполкомов, члены Совета по развитию предпринимательства при Гродненском облисполкоме, руководители центров поддержки предпринимательства, большая группа деловых людей, различного ранга чиновники.

Важным моментом семинара было посещение производственных объектов негосударственного сектора экономики: СП "Леорпластик", где налажено производство изделий из пластмассы, рыбных и овощных консервов; филиала иностранного предприятия "ДАР"(производство глазированных сырков); ПКФ "Виктория", специализирующейся на швейном деле, и др.

Участники семинара получили информацию о развитии предпринимательства в Новогрудском районе. Здесь на начало т.г. было зарегистрировано 574 предпринимателя без образования юридического лица, 39 коммерческих предприятий, среди которых 25 обществ с ограниченной ответственностью, 2 малых предприятия, 4 закрытых акционерных общества, 2 совместных, 2 иностранных и 4 частных предприятия. ИП "Медис", например, и СП "Валорекс" занимаются лесопилением и деревообработкой, ООО "Манометр" - производством измерительных приборов. ООО "Провит" выпускает картофельные хлопья. Трансляцию программ кабельного телевидения ведет ООО "Нота-ТВ". Печатную продукцию выпускает ООО "Мерком" и т.д. На коммерческий предприятиях занято около 440 человек. За 7 месяцев т. г. ими уплачено 34,4 миллиарда рублей налогов, в то время как предпринимателями без образования юридического лица - 19,6 миллиарда рублей. Это составило 5,6 процента от общей суммы налоговых поступлений в бюджет.

На семинаре практически не было выступлений, бравших под сомнение целесообразность дальнейшей поддержки развития предпринимательства со стороны властных структур. Было заострено внимание и на забастовке, охватившей гродненский вещевой рынок "Южный". Не прошел мимо этого события и начальник управления Министерства предпринимательства и инвестиций Сергей Гараев. В этой связи не лучшим образом характеризовался чиновниками один из лидеров забастовочного движения Валерий Левовский.

В. СТАРОБЕЛЬСКИЙ

Бюллетень потребителя

В сентябре вышел в свет первый, пробный, номер бюллетеня "Гродненский потребитель". В обращении к читателям вице-президента правления общественного объединения "Гродненский городской центр защиты прав потребителей" Алексея Шульги говорится, что издание бюллетеня продиктовано сложившейся в городе негативной ситуацией в области правовой грамотности населения, 90 процентов которого не обладает полной и достоверной информацией о потребительских свойствах, ассортименте и качестве, уровне цен, тарифов на реализуемые товары, а также о насыщенности ими потребительского рынка.


О необходимости или, наоборот, о ненужности такого бюллетеня вы можете сообщить в Центр защиты прав потребителей по адресу: ул. Студенческая, 8 - 1; тел. 44 - 78 - 28. А вот рубрика "Не допусти просчета" читателя не оставит равнодушной. Издатель обещает указывать цены на интересующие потребителя товары в 20-ти находящихся в разных районах города магазинах . А в порядке иллюстрации приводятся цены на сахар. Так, 31 августа он отсутствовал в 13 магазинах. Самый дешевый сахар был отмечен в ГТП-17 по ул. Поповича, 14 - 155 тысяч рублей за килограмм. А вот самый дорогой предлагало ГТП-34 по ул. Дзержинского, 113а - 292 тысячи рублей за килограмм.

Остается сожалеть, что тираж миниатюрного издания - 299 экземпляров. Оно распространяется бесплатно на правах внутренней документации. Лиха беда - начало?

А. ИЛЬИН

ЕСТЬ ЛИ В "НЕМАНЕ" ЗОЛОТАЯ РЫБКА?

Это самый большой магазин в Гродненской области. По привычке его называют универмагом. Понятие "супермаркет" к нему еще не пристало, а словосочетание Торговый дом "Неман" г.Гродно звучит длинновато, хотя и соответствует истине, как и то, что с некоторых пор этот универмаг преобразован в открытое акционерное общество. По сравнению с другими магазинами здесь все гораздо масштабнее. Например, объем розничного товарооборота только за 6 месяцев т.г. превысил 766 миллиардов рублей, а прибыль от реализации - 28,6 миллиарда рублей. Здесь свои успехи и свои проблемы. О них рассказывает читателям "БИ" директор Торгового дома "Неман" Александр Ковшик, любезно согласившийся ответить на вопросы нашего корреспондента.



Директор Торгового дома "Неман" Александр Ковшик.

- Бастуют лавочники вещевых рынков. А это множество продавцов, и море товаров, и тысячи покупателей, которые "заморожены" в сентябре на одном только "Южном". Как это сказалось на продажах Торгового дома? И шире: ощущаете ли вы конкуренцию?

- Во время забастовки гораздо больше покупателей посещает Торговый дом, товарооборот в субботу и воскресенье значительно увеличился. И это понятно: все, кто намеревался приобрести товары на рынке, направились в торговые предприятия города.

Составляет ли торговля на рынке нам конкуренцию? В какой-то мере - да. В основном по части цен на товары, хотя и далеко не по всей номенклатуре. И все же цены на рынке по ряду изделий ниже, чем в Торговом доме. Объясняется это следующим. Во-первых, на рынке торгуют в основном те коммерсанты, которые самостоятельно ввозят товары из-за границы; мы же продаем товар, ввезенный кем-то. Во-вторых, товар продаваемый в Торговом доме, сертифицирован, а это требует немало средств. И, в-третьих, на наши товары заплачены все установленные налоги, сборы, акцизы и т.д.

Но не все покупатели отдают предпочтение рынку. Покупка в Торговом доме имеет ряд преимуществ: здесь ассортимент товаров намного шире, отдельные их группы на рынке вообще не продаются. Условия совершения покупки у нас более удобные - это и крыша над головой, и просторные залы с современным торговым оборудованием, и квалифицированная помощь продавца-консультанта, и условия для примерки обуви или одежды, и наличие ряда дополнительных услуг (продажа в кредит, подгонка одежды, подарочная упаковка и др.). И, конечно, самое главное - это гарантия качества товаров. В Торговом доме имеются сертификаты на все товары, подлежащие сертификации. Все поступающие в продажу товары подвергаются проверке по качеству, строго контролируются сроки годности и сроки реализации, соблюдается Закон о защите прав потребителей.

Кроме того, в Торговом доме открыты три секции , торгующие за иностранную валюту. Здесь можно, не нарушая законы и ни от кого не прячась, рассчитаться за товар иностранной валютой. А все вместе взятое и привлекает покупателей в Торговый дом "Неман" и делает их нашими постоянными клиентами.

- Каким образом смена формы собственности сказалась на деятельности "универмага"? Что для вас как субъекта хозяйствования местная власть? Насколько, иными словами, ОАО хозяин в своем бизнесе?

- 30 марта 1995 г. Гродненский универмаг был преобразован в открытое акционерное общество "Торговый дом "Неман" г. Гродно". Инициатором этого процесса выступил трудовой коллектив. В настоящее время ему принадлежит около 43 процентов акций. Прежний собственник - горисполком оставил в своем ведении лишь 17 процентов акций. Остальные 40 процентов акций куплены жителями города и области на чеки "Имущество". И теперь мы вправе говорить, что акционерное общество действительно стало хозяином в своем бизнесе. При этом в лучшую сторону изменилось отношение к делу трудового коллектива, особенно владельцев акций. Им обеспечено участие в управлении акционерным обществом, в решении задач, стоящих перед ним с позиции собственника.

Главная цель деятельности АО - получение прибыли. Но, в отличие от других предприятий, поменявших форму собственности и использующих всю прибыль на зарплату и дивиденды, наше акционерное общество работает на перспективу: 50 процентов прибыли направляется на развитие материально-технической базы предприятия. Так, с момента образования ОАО был переоборудован первый этаж Торгового дома, завершается этот процесс и на втором этаже.

Для получения товаров с промышленных предприятий приобретено 9 грузовых автомобилей. Благодаря этому мы работаем с поставщиками на прямых связях, без посредников, что положительно сказывается на уровне цен реализуемых в Торговом доме товаров. Цены у нас ниже, чем в других магазинах города. Средняя торговая наценка за 6 месяцев составила по предприятию 19 процентов. Торговые наценки утверждаются правительством, и они очень низкие. К примеру, на продовольственные товары - от 5 до 10 процентов. Поэтому и рентабельность за первое полугодие - всего-навсего 4 процента. Это сильно ограничивает экономические возможности торгового предприятия.

Высшим органом управления АО является собрание акционеров. Оно решает все ключевые вопросы жизнедеятельности общества: определяет основные направления работы, утверждает смету использования прибыли, оценивает работу общества и т.д. В период между собраниями интересы акционеров представляет Правление АО. На заседаниях Правления - его председателем является Тамара Николаевна Кривец - регулярно заслушиваются отчеты о работе различных служб и отделов Торгового дома "Неман", определяются меры по повышению эффективности их работы. Контроль же со стороны АО осуществляет ревизионная комиссия, избираемая на собрании акционеров.

- Много, мало ли, на ваш взгляд, импортных товаров на полках "Немана"? И как официальный курс валюты сказывается на деятельности торгового предприятия?

- Удельный вес импортных товаров в товарообороте Торгового дома составляет порядка 20 процентов. На наш взгляд, это мало. Мы бы с удовольствием работали с иностранными партнерами, и опыт такой работы у нас имеется. Основным препятствием в этом виде деятельности является невозможность приобретения валюты для расчетов с поставщиками. Инвестировать этот процесс желающих нет. Идти по пути приобретения импортных товаров у посредников невыгодно ни нам, ни покупателю, так как посредники закладывают в цену свой интерес (и он немалый). Добавьте к этому низкий курс валюты с учетом подстраховки. А в результате вырисовывается цена, неприемлемая для нашего покупателя.

Валютный курс оказывает непосредственное влияние на продажу импортных товаров. На момент получения товары из-за высокой цены продаются медленно. Но как только начинает расти курс, покупатели "выметают" импортные товары, так как на них снижается цена в долларовом эквиваленте. Цены на новые поступающие товары выше: в это время закладывается новый курс, и товар опять оседает в магазине до следующего роста курса доллара...

- В мае я собрался купить костюм, не раз заходил и в "Неман", но хоть бы раз у меня поинтересовались, когда я потел в примерочной, "чего тебе надобно, старче?" И все же купил. Правда, в другом магазине. А Торговый дом проиграл 15 миллионов рублей. И вот теперь не могу купить туфли... Как вы прокомментируете подобное обслуживание клиента?

- Факты низкой активности продавцов имеют место и в Торговом доме, но мы не миримся с таким положением. Наши работники периодически повышают свою квалификацию, мы совершенствуем меры материального и морального стимулирования за результаты труда, ужесточили контроль за работой торгового зала путем установки системы видеонаблюдения, Но, видимо, истоки этой "болезни" нужно искать не только на уровне организации торгового процесса, но и в социально-экономической ситуации в целом.

- Говорят, что в "Немане" водится золотая рыбка - имеются в виду дивиденды...

- Дивиденды акционерам Торгового дома выплачиваются регулярно, что в данный момент является редкостью для большинства акционерных обществ. А вот наши акционеры получают дивиденды ежеквартально. За 1998 год на каждую акцию начислено дивидендов 43033 рубля. По результатам работы за 6 месяцев т.г. - 46136 рублей. Очевидно, не всех устраивают названные суммы, но ведь другие и этого не имеют...

- Участвуете ли вы в аукционах по продаже коммунального имущества - покупаете ли магазины? Каковы планы Торгового дома на ближайшие 2 - 3 года?

- В настоящее время ОАО "Торговый дом "Неман" не участвует в аукционах по продаже магазинов. Это связано с трудностями по насыщению товарами торговых площадей. Это касается и товаров отечественного производства, и импортных. Товары, выпускаемые белорусскими предприятиями, отличаются высокими потребительскими свойствами, качество их приближается к мировому уровню. От импортных они отличаются сравнительно невысокими ценами и соответствуют доходам нашего населения. Но получать эти товары в достаточном количестве мы не можем в виду того, что эти товары в основном квотируемые. По отдельным предприятиям имеются трудности даже в том, чтобы забрать выделенную квоту.

Наряду с традиционной розничной торговлей промышленными товарами Торговый дом "Неман" удачно освоил торговлю продовольственными товарами, доля которых в товарообороте в настоящее время составляет 20 процентов. Мы занялись оптовой торговлей и общественным питанием. Кроме работающего на первом этаже бара у нас есть столовая, расположенная на четвертом этаже. Если раньше столовая обслуживала только работников Торгового дома, то теперь она открыта для всех посетителей и пользуется популярностью. Конечно, эта сфера деятельности требует больших затрат времени и энергии и приносит не очень большой доход, но она помогает в решении главной задачи предприятия, которую можно сформулировать как заботу о людях, их удобствах и благополучии.

Из этой задачи вытекают и планы на будущее. Это и дальнейшее повышение культуры обслуживания, и оснащение торговых залов современным торговым оборудованием, и развитие дополнительных услуг, и обеспечение бесперебойной торговли широким ассортиментом товаров. И параллельно с решением этих задач нам бы хотелось открыть сеть филиалов Торгового дома "Неман" в различных микрорайонах г.Гродно, да и в других городах области и республики. Но для этого нужен большой капитал, которым мы пока не располагаем.

- Спасибо, Александр Иванович, за интервью.

Беседу вел Вадим ЖУРАВЛЕВ

Страчаная спадчына

Гарадзенскія ваколіцы

(Працяг. Пачатак №29, 31, 33)



Палац у Мураванай Берастаўіцы. Здымак да 1939 г.


Берастаўіца МАЛАЯ

Вёска, цэнтар сельскага савета Берастаўіцкага раёну.

Упершыню ўзгадваецца ў 1512 годзе як двор Хадкевічаў, потым належала князям Масальскім. У XVIIIст. належала Стрыенскім і, ў рэшце рэшт, пераходзіць да шляхцічаў Валкавыцкіх, якім і належала да верасня 1939 года. Меўся стары, на думку Юзэфа Ядкоўскага, XVIст. драўляны палац з гонтавым дахам. Яшчэ ў XVIIIст., а дакладней у 1795 годзе, узгадваецца "вельмі старая мураваная царква, некалі праваслаўная, а зараз - уніяцкая...". На жаль, гэты помнік не захаваўся. Валкавыцкія зафундавалі ў 1859 годзе касцёл, які быў збудаваны ў 1868 годзе. Потым яго забралі пад праваслаўную царкву, а ў 1919 годзе гэта быў ізноў касцёл. Фальварак Ваўкавыцкіх меў у канцы XIX - пачатку XX ст. узорную гаспадарку. Існаваў бровар, стайня высакародных рысакоў арлоўскай і амерыканскай пароды, а на продажы збожжа штогод Ваўкавыцкія зараблялі больш за дзве тысячы серабром. І фальварак, і сядзіба былі разрабаваны чырвонаармейцамі двойчы - у 1920 і ў 1939 годзе. Некалькі партрэтаў з палацу захоўваюцца ў Маскве ў Гістарычным музеі. Рукапісы XVIIIст. на польскай мове, якія паходзілі з палацу ў Малой Бераствіцы, былі набыты ў адной з антыкварных крамаў Варшавы для бібліятэкі інстытута Гувара. Зараз ад усіх рэчаў сядзібы Ваўкавыцкіх застаўся толькі мураваны аднапавярховы палац, пабудаваны ў 1785 годзе, а вось даўні драўляны двор згарэў у 1920 годзе. Пра мураваны палац існуе версія, што ён адносіўся некалькі да кальвінскага збора. Гэта магчыма, таму шта Хадкевічы падтрымлівалі прагэстантаў. Пры сядзібе калісьці быў неблагі пейзажны парк.



Партрэт Тэрэсы Юндзіл. Канец XVII ст. Мастак Лампі



Станіслаў Солтан. Канец XIX ст. Мастак Лампі


Вялікая Берастаўіца

Наколькі вядома аўтару, ад пачатку існавалі і мястэчка і двор (сядзіба) Вялікая Берастаўіца. Гэтая пара - мястэчка і двор, захоўваліся да верасня 1939 года. Мястэчка засталося амаль не кранутым вайной, а вось сядзіба - практычна на 90% загінула. Увогуле шляхецкая сядзіба Вялікая Берастаўіца складалася з вельмі розных стылёвых частак: на думку спецыялістаў, да 1939 года ў маёнтку Вялікая Берастаўіца існаваў драўляны палац XVII ст. яшчэ з часоў Хадкевічаў. Польскі спецыяліст Раман Афтаназі лічыць, што будынак (мураваны аднапавярховы) паходзіў з пачатку XIX ст., але я думаю, што будынак існаваў ужо ў 1796 годзе. У той жа сядзібе знаходзіўся і "новы" палац - выдатны прыклад эклектыкі. Аўтарам праекта быў вельмі добры архітэктар - Юлій Васюцінскі. Аб інтэр'ерах палацаў можна было б напісаць шмат, але гэта не газетная тэматыка. Узяць да прыкладу мэблю - самыя каштоўныя экзэмпляры паходзілі з Францыі (у стылі Людовіка XIV, Людовіка XV, Людовіка XVI, "ампір", Людовіка Філіпа), з Англіі - "бідэнмэер", "сімлер", найдаражэйшыя польскія ўзоры - "гданьская мэбля", мэбля з "княства Варшаўскага" (на думку аўтара - з майстэрні Крышынскіх). А самая цікавая рэч, якая там знаходзілася - шафа ў стылі ампір, якою згодна легенды атрымаў адзін з ад'ютантаў імператара Напалеона, тагачасны ўладальнік маёнтка, генерал Іосіф Касакоўскі. Легенда да таго ж гаворыць, што да верасня 1939 года, у гэтай шафе ляжаў мундзір Напалеона і некалькі дробных рэчаў, якія яму належалі (філіжанкі саскай парцэляны, бінокаль, шахматныя фігуры са слановай косці). У тым жа палацы была два вельмі знакамітых фартэпіяна - майстроў Бехштэйна і Блютнера і шэраг старажытных музычных інструментаў.

> ***"...Магчыма, больш за 200 вельмі рэдкіх абразоў (між іншым фламанскай, галандскай італьянскай школы) XVI-XIX стст. не згарэлі ў полымі "верасня 1939 года", а да гэтай пары ляжаць у запасніках маскоўскіх ці піцерскіх музеяў".***

Навогул, лёс антыкварных рэчаў з палацу Касакоўскіх з сядзібы Вялікая Берастаўіца вельмі цьмяны. Па адных звестках палац з ўсім што там было згарэў пад час "вызвалення Заходняй Беларусі". Аўтар аднак жа на ўласныя вочы пабачыў у Маскве частку рэчаў з Вялікай Берастаўіцы адзінаццаць гадоў таму. Больш таго - у ленінградскіх (у той час) магазінах антыкварнай кнігі прадаваліся выданні з экслібрысам Касакоўскіх з Вялікай Берастаўіцы. Урэшце у адным з гарадзенскіх архіваў ёсць сведчанні аб тым, што частка жывапіснага збору з Берастаўіцы трапіла ў 1940 годзе ў абласную карцінную галерэю Беластока.

Гэта між іншым азначае, што, магчыма, больш за 200 вельмі рэдкіх абразоў (між іншым фламанскай, галандскай італьянскай школы) XVI-XIX стст. не згарэлі ў полымі "верасня 1939 года", а да гэтай пары ляжаць у запасніках маскоўскіх ці піцерскіх музеяў. Аўтар, канешне, мог бы пералічыць мастакоў з гэтай калекцыі, назваць сённяшнюю цану гэтых абразоў па цэнах "Сотбі". Але што гаварыць - у верасні 1939 года была страчана два сучасных гадавых бюджэта Гарадзенскай вобласці.



Палац у Вялікай Берастаўіцы. 1901 г. Архітэктар Ю. Васюцінскі.

Берастаўіца МУРАВАНАЯ

Вёска Алекшыцкага сельскага савета Берастаўіцкага раёна.

